*Ігнатовіч П. Р., кандыдат гістарычных навук,*
*загадчык кафедры БУК*

# АБ'ЕКТЫЎНАЯ АБУМОЎЛЕНАСЦЬ РЭГУЛЯВАННЯ СФЕРАЙ КУЛЬТУРЫ

Сусветная практыка і айчынны вопыт сведчаць аб выключнай ролі рэгулявання культурнага жыцця ў любой краіне. Асабліва гэта тычыцца пераломных момантаў грамадскага развіцця. Адразу трэба зазначыць: пытанне гэта не такое простае, як можа паказацца на першы погляд. Аўтар прытрымліваецца пазіцыі, што рэгуляванне, упраўленне працэсамі ў сферы культуры носіць аб'ектыўны і заканамерны характар. Аднак ёсць і іншы погляд. Ён распаўсюджаны перш за ўсё сярод саміх дзеячаў, творцаў культуры, часам зусім катэгарычна адмаўляючых саму магчымасць "умяшання" дзяржавы, альбо якіх бы то ні было іншых інстытутаў у такую тонкую і далікатную справу, як культурная творчасць. Сцвярджаецца, што асаблівая роля творчага пачатку культуры, што звязана ў значнай ступені з індывідуальнай дзейнасцю пісменнікаў, музыкантаў, мастакоў, не ўкладваецца ў межы рэгламентацыі.

Тым не менш вядома, што гістарычна існавалі і існуюць мноства рознага роду інстытутаў, рэгулюючых культурнае жыццё. Аб гэтым сведчыць і цэлы шэраг арганізацый, існуючых у рамках Арганізацыі Аб'яднаных на-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цый. Перш за ўсё гэта ЮНЭСКА. Па яе ініцыятыве ААН аб'явіла аб сусветным дзесяцігоддзі культуры 1988—1997 гг. Галоўная мэта гэтай акцыі заключалася ў тым, каб асэнсаваць шляхі забеспячэння культурным каштоўнасцям цэнтральнае месца ў эканамічным і тэхнічным развіцці пры дапамозе: уліку культурнага аспекта ва ўсіх сацыяльна-эканамічных і тэхнічных праектах развіцця; адраджэння і ўзбагачэння культурнай самабытнасці народаў, адлюстроўваючых іх погляд на свет і прадстаўлення аб саміх сабе; расшырэння ўдзелу ўсіх людзей у культурным жыцці; развіцця міжнароднага культурнага супрацоўніцтва.

Трэба сказаць, што сфера культуры па лініі дзяржаўнага і галіновага падпарадкавання, а значыць і ўпраўлення, кіравання на сённяшні дзень недастаткова адпрацавана. У выніку ў нашай краіне існуе некалькі міністэрстваў і ведамстваў, якія маюць непасрэднае дачыненне да сферы культуры. Гэта, безумоўна, перш за ўсё Міністэрства культуры. Але гэта і Міністэрства адукацыі і Міністэрства друку, у пэўнай меры Міністэрства спорту і турызму, сістэма тэлерадыёкамунікацый і г.д. Сфера культуры, безумоўна, у значнай ступені залежыць ад дзейнасці міністэрстваў фінансаў, эканомікі, працы і іншых. Канешне, Міністэрства культуры адыгрывае рашаючую ролю, і мы пры аналізе данай праблемы будзем зыходзіць перш за ўсё з гэтай пасылкі. Пералічанныя акалічнасці ўжо самі па сабе з'яўляюцца важным аргументам на карысць аб'ектыўнай і заканамернай неабходнасці кіравання сферай культуры.

У развіцці культурнага працэса ўзнікаюць сітуацыі паміж тэндэнцыямі да цэнтралізацыі культурнай дзейнасці з боку дзяржавы і яе дэмакратызацыяй, якой патрабуюць неўрадавыя арганізацыі. Але ўмяшальніцтва ўрадавых органаў у работу культурных арганізацый і груп часта проста неабходна, бо без дзяржаўнай падтрымкі яны не могуць вытрымаць рознага рода цяжкасцей, не толькі фінансавых, але і прававых, палітычных і г.д. Разам з тым умяшальніцтва можа стварыць пагрозу залежнасці культурнай дзейнасці ад улады, ад правячых колаў, што можа прывесці да дэфармацыі культурнага жыцця.

Гісторыя дае нам шмат прыкладаў, калі дзяржава і царква, з аднаго боку, былі галоўнымі інстытутамі, падтрымліваючымі навуку, літаратуру, мастацтва, а з другога, — яны ж забаранялі тыя накірункі, альбо адказвалі ў пратэжыраванні і апякунстве тым творцам, якія ці пярэчылі "грамадскім нормам", ці наносілі ўрон дзяржаве або царкве.

На больш позніх этапах функцыі рэгуляцыі ў сферы культуры пачынаюць падпарадкоўвацца рынку. Але прававыя прынцыпы нязменна карэкціравалі рыначную стыхію. Наогул, у сусветнай практыцы няма прыкладаў, калі б толькі рынак з'яўляўся рэгулятарам у сферы культуры. У дапаўненне сфарміраваліся розныя іншыя органы, інстытуты і формы рэгуляцыі культурнай жыццядзейнасці: фонды, спонсарства, мецэнацтва, патранаж, рознага рода прэміі, устанаўленне званняў, арганізацыя акадэмій і г.д.

Дзяржава — гэта асобы сацыяльны інстытут, аказваючы ўплыў на культуру. І хаця ні сутнасць, ні дынаміка, ні лёс дзяржавы не супадаюць прама



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з дынамікай культуры, у кожным грамадстве дзяржава ў тым ці іншым аб'ёме падтрымлівае сферу культуры як праз бюджэтнае фінанасаванне, так і спецыяльным заканадаўствам або спецыяльнай палітыкай. Але ажыццяўленне прынцыпаў плюралізацыі і дэмакратызацыі і іншыя фактары прыводзяць да таго, што падтрымка з боку дзяржавы непазбежна абмежавана. Пагэтаму культура ў значнай ступені функцыяніруе ва ўзаемадзеянні з іншымі сферамі дзейнасці і рэгуляцыі, перш за ўсё з гаспадарчай сферай, рынкам, у тым ліку і з рынкам культуры.

Ітак, дзяржава з'яўляецца тым сацыяльным інстытутам, тым органам, які фарміруе і праводзіць у жыццё палітыку ў галіне культуры. Палітыка ў галіне культуры — гэта сістэма юрыдычна-прававых, эканамічных, сацыяльна-палітычных, арганізацыйных і іншых мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне пажаданай для грамадства і здавальняючай асобу, сацыяльныя слаі і групы культурнай сітуацыі, ствараючай умовы для плённага, гарманічнага развіцця культуры і асобы, аптымізацыі сацыяльных адносін у галіне культуры.

Культурная палітыка ў нашай краіне будуецца на аснове Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкул 51 якой дэкларыруе правы грамадзян на ўдзел у культурным жыцці (Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Мінск, 1997. С. 15).

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь абвяшчае, што права беларускага народа карыстацца культурай забяспечваецца агульнай даступнасцю каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, знаходзячыхся ў дзяржаўных і грамадскіх фондах, развіццём сеткі культурна-асветных устаноў. Канстытуцыяй гарантуецца свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання. Дзяржава садзейнічае развіццю культуры, навуковых і тэхнічных даследаванняў на карысць агульных інтарэсаў.

Галоўнай задачай культурнай палітыкі павінен стаць пад'ём нацыянальнай самасвядомасці беларускай нацыі, стварэнне ў краіне такіх умоў, пры якіх мог бы свабодна праяўляцца яе нацыянальны характар. Гэта ў сваю чаргу дазволіць прадстаўнікам іншых этнасаў, пражываючых на тэрыторыі Беларусі, плённа развіваць самабытнасць сваіх культур, праяўляць свае нацыянальныя асаблівасці.

Але права чалавека свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці само па сабе недастаткова. Культурную дзейнасць патрэбна яшчэ і стымуляваць. Сусветная супольнасць усвядоміла, што "культурнае развіццё павінна стаць клопатам і абавязкам сучаснай дзяржавы і ўсіх іншых інстытутаў, прымаючых рашэнні аб стратэгіях, праграмах і праектах грамадскага развіцця".

Натуральна, што фарміруе і ажыццяўляе культурную палітыку ў любым грамадстве, у нашым у тым ліку, перш за ўсё дзяржава, яе органы ва ўзаемасувязях з іншымі сацыяльнымі інстытутамі, грамадскімі і творчымі аб'яднаннямі, саюзамі і рухамі. У Беларусі склалася мадэль кіравання культурай, заснаваная на моцнай урадавай адміністрацыі, якая не толькі падтрымлівае культуру фінансава, але і каардынуе работу іншых урадавых і няўрадавых структур.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Палітыка дзяржавы ў галіне культуры заключаецца перш за ўсё ў стварэнні эканамічных і арганізацыйна-прававых умоў развіцця культуры, захаванні і забеспячэнні эфектыўнай дзейнасці яе прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, падрыхтоўкі і сацыяльнай абароны работнікаў культуры, дзеячаў мастацтва, у стымуляванні любіцельскіх аб'яднанняў і самадзейнай народнай творчасці. Дзяржаўныя органы ва ўзаемадзеянні з грамадскімі арганізацыямі павінны забяспечыць развіццё культуры і несці адказнасць за духоўнае, маральнае, эстэтычнае выхаванне грамадзян, — што дэкларыруецца ў раздзеле “Абавязкі дзяржавы ў галіне культуры” Закона аб культуры. Яны абавязаны ўдасканальваць сістэму сацыяльных, арганізацыйна-прававых і эканамічных гарантый развіцця культуры і мастацтва, стварыць неабходныя ўмовы для далучэння грамадзян да нацыянальнай і сусветнай культурнай спадчыны. Фарміраваць сістэму прадпрыемстваў і ўстаноў, выдзяляць неабходныя сродкі, забяспечыць правядзенне навуковых даследаванняў і распрацоўку навуковых праектаў у галіне культуры, падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў, стварыць гарантыі і стымулы мастацкай творчасці, захавання традыцый культуры (фальклор, народныя промыслы і рамёствы), выкарыстання дасягненняў культуры.

Асноўныя накірункі культурнай палітыкі нашай дзяржавы сфармуляваны ў шэрагу заканадаўчых актаў. Перш за ўсё гэта Закон аб культуры. Трэба зазначыць, што гэты закон распрацоўваўся і прымаўся ў 1991 г., тады яшчэ — у БССР, якая ўваходзіла ў склад Савецкага Саюза. Гэта быў першы закон аб культуры на ўсей прасторы СССР, ён з'яўляецца сведчаннем увагі з боку дзяржавы да праблем культуры. Пасля гэтага, ужо ў рамках сувярэннай Рэспублікі Беларусь, прыняты цэлы шэраг заканадаўчых актаў. Трэба падкрэсліць, што заканатворчая дзейнасць наогул, у тым ліку, або можа нават, перш за ўсё ў галіне культуры, і аб'ектыўна, і суб'ектыўна звязана з вялікай колькасцю цяжкасцей.

Тым не менш, прасачыўшы дынаміку законатворчай дзейнасці ў галіне культуры, можна зрабіць выснову, што за 90-я гг. ў краіне ў гэтым напрамку зроблена нямала. Следам за законам аб культуры, аб якім ішла гаворка вышэй, у 1992 г. прыняты закон “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны”, у 1995 — закон “Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь”, у 1996 — закон “Аб аўтарскім праве і сумежных правах”, закон “Аб музеях і музейных фондах Рэпублікі Беларусь”, у 1997 — закон “Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Бернскай канвенцыі аб ахове дзяржаўных і мастацкіх твораў”, у 1998 — закон “Аб ліцэнзаванні гастрольна-канцэртнай дзейнасці”, у 1999 г. — закон “Аб народным мастацтве, народных промыслах” і іншыя.

Сведчаннем увагі дзяржаўных органаў да культуры з'яўляецца і тое, што у чэрвені 1998 г. адбыліся парламенцкія слуханні па пытаннях развіцця культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ